Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



Алена Астапчук
Мінск

# Паланізмы ў прозе сучасных беларускіх аўтараў (на матэрыяле твораў П. Касцюкевіча, В. Марціновіча і інш.)

*Polonisms in the Prose of Modern Belarusian Authors (on the Material of Works by P. Kastsyukevich, V. Martsinovich and Others)*

Актыўнае выкарыстанне запазычанняў у сучаснай беларускай мове звязана з агульнай для ўсіх славянскіх моў тэндэнцыяй да інтэрнацыяналізацыі, „якая мае аднолькавае праяўленне і аднолькавыя вынікі – павелічэнне долі іншамоўных запазычанняў у нацыянальных лексіконах, г.зн., па сутнасці, іх збліжэнне”.[1] З другога боку, актуалізацыя ва ўжыванні паланізмаў абумоўлена, пурыстычнай тэндэнцыяй да нацыяналізацыі (як вынік адштурхоўвання ад рускай мовы). Калі раней іншамоўная лексіка папаўнялася ў асноўным праз пасрэдніцтва рускай мовы і непасрэдна русізмамі, то ў апошнія дзесяцігоддзі „праяўляецца тэндэнцыя пазбаўлення ад русізмаў, актывізуецца працэс запазычвання лексікі з польскай мовы і праз яе пасрэдніцтва…”.[2]

У мове твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў найбольш частотнымі з’яўляюцца такія паланізмы, як *імпрэза, выступ, валіза, кіроўца, выбітны, слынны, файны, тло, тэчка, фатэль, палягаць, пекны, мапа, выкшталцоны*. Яны замяняюць існаваўшыя да нядаўняга часу лексемы, якія „перасталі задавальняць з пункту гледжання некаторых носьбітаў беларускай мовы сучасным запатрабаванням пурыстычнага характару”.[3]

Віктар Марціновіч – п**ісьменнік, журналіст, мастацтвазнаўца, палітолаг –** дэбютаваў у літаратуры ў 2009 годзе рускамоўным раманам *Параноя* (на продаж гэтай кнігі ў Беларусі ўлады наклалі неафіцыйную забарону). У чэрвені 2011 года

[1] А. А. Лукашанец, *Асаблівасці сучаснага польскага ўплыву на беларускую мову,* [у:] *Польска-беларускія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: Матэрыялы XVI Міжнароднай канферэнцыі „Шлях да ўзаемнасці”*, Беласток 2009, с. 31.
[2] В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч, *Слоўнік новых слоў беларускай мовы,* Мінск 2009, с. 10.
[3] А. А. Лукашанец, *op. cit.*, с. 36.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



пісьменнік прэзентаваў свой першы беларускамоўны раман *Сьцюдзёны вырай*. Паводле слоў аўтара, гэты твор мусіў распаўсюджвацца выключна ў электронным выглядзе і не выходзіў у друкаваным варыянце. За гэты раман у 2012 годзе Віктар Марціновіч быў уганараваны Літаратурнай прэміяй „Дэбют" імя Максіма Багдановіча ў галіне прозы.

У тэксце рамана *Параноя*, напісанага на рускай мове, паланізмаў не заўважана, а вось у творы *Сцюдзёны вырай* В. Марціновіч выкарыстоўвае даволі шмат паланізмаў, сярод якіх *тэлевізія* (telewizja – тэлебачанне[4]), *унёсак* (wniosek – прапанова, заключэнне, выснова), *атракцыя* (atrakcja – забава, уцеха; цікавінка), *агенцыя* (agencja – агенцтва, прадстаўніцтва), *капэрта* (koperta – канверт), *выбітны* (wybitny – выдатны) і іншыя. Напрыклад:

*Новая іракская тэлевізія! Амерыканцы прывезлі ў Ірак свабоду!*

*Звычайна гэты „стартавы" артыкул станоўчы і падкрэслівае **ўнёсак** асобы ў развіццё цывілізацыі ды барацьбы з рэжымам.*

*Кляштары, якія знаходзяцца ля дарог, з'яўляюцца выключна турыстычнай **атракцыяй**, і там цябе сустракаюць не манахі, а экскурсаводы.*

*У **агенцыі**, якая дапамагла мне зняць кватэру, растлумачылі, што такі другі выхад – звычайная з'ява ў старажытнай архітэктуры…*

*Тыя, хто працуе за грошы, жывуць вельмі сціпла, бо пражыць на тыя 100 баксаў, якія сарамліва кладуць у **капэрце**… – немагчыма.*

*Нейкім чынам – можа, гіпнозам якім, Пільняк запэўніў тую, што з'яўляецца **выбітным** прадстаўніком літаратуры, з якой жанчына кармілася.*

Павал Касцюкевіч – аўтар кніг апавяданняў, перакладчык сучаснай ізраільскай і амерыканскай прозы (пераклаў на беларускую мову творы Э. Керэта, К. Вонегута) – скончыў псіхалагічна-сацыялагічны факультэт Тэль-Авіўскага Акадэмічнага каледжу, потым пераехаў у Мінск. У сакавіку 2012 года стаў першым літаратарам, узнагароджаным Прэміяй імя Ежы Гедройца за кнігу *Зборная РБ па негалоўных відах спорту*.

У гэтай кнізе П. Касцюкевіча трапляюцца такія паланізмы, як *гжэчна* (grzecznie – далікатна, ветліва), *лётнішча* (lotnisko – аэрадром), *фрызура* (fryzura – прычоска), *выкшталцона* (wykształcony – 1. адукаваны; 2. сфарміраваны). Напрыклад:

*Ля гастранома ідзе невысоканькая, **гжэчна** апранутая бабулька, якая крыху так выбіваецца з агульнай моды.*

*Здраднік горшы за ворага, таму са словамі: „Ты мне быў сябрам!" – я смаляў Андрэю ў жывот, і той ляцеў носам у хмызы (адкуль яны там, на **лётнішчы**?).*

*Ішлі замежныя прафесары, знаўцы трох падзелаў Рэчы Паспалітай, з партфелямі і ноўтбукамі, крочылі шаноўныя спецыялісткі па паўстанні 1863 года, з **фрызурамі** і педыкюрам.*

[4] Тут і далей пераклад падаецца па выданні: Я. В. Волкава, В. Л. Авілава, *Польска-беларускі слоўнік*, рэд. Г. А. Цыхун, Мінск 2004.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



*І раптам – ні стуль ні ссюль, пасярод акту нацыянальнага кучкавання – хто гэта так* ***выкшталцона*** *вынырвае з-пад зямлі, лянотна выпускаючы фантанчык нашага неўрадлівага суглінку*?

Зміцер Вішнёў піша вершы, прозу, крытыку, займаецца жывапісам. Да 2006 года быў кіраўніком перформаснага праекта *Спецбрыгада афрыканскіх братоў*. Аўтар кніг *Тамбурны маскіт* (2001), *Верыфікацыя нараджэння* (2005), *Фараон у заапарку* (2007) і інш. Удзельнік шматлікіх міжнародных паэтычных фестываляў і кангрэсаў. Творы З. Вішнёва перакладзены больш чым на дваццаць моў.

У рамане *Замак пабудаваны з крапівы* пісьменнік прыбягае да такіх паланізмаў, як *памаранчавы* (pomarańczowy – апельсінавы, аранжавы), *тэмат* (temat – тэма), *пігулка* (pigułka – пілюлька; таблетка), *візітоўка* (wizytówka – візітная картка; візітоўка, візітка), *гарнітур* (garnitur – 1. касцюм (мужчынскі); 2. гарнітур, камплект, набор), *цытрына* (cytryna – лімон; цытрына; cytrynowy – лімонны):

*Страчваюцца тэлефоны ўсіх колераў і адценняў – чырвоныя, салатныя,* ***памаранчавыя****, бэзавыя.*

*Люблю Борхеса. Люблю смерць. Чытаю час ад часу кніжкі на гэты* ***тэмат****.*

*На пэўны момант ператварыўся ў* ***пігулку*** *і даў нырца ў страўнік… Не паеў мяса – і здаецца, што звярэеш. Нібы прыняў* ***пігулку*** *азвярыну!*

*Колькім дзяўчатам ты раздарыў свае* ***візітоўкі*** *– і не пералічыць…*

*На Пётры быў чорны* ***гарнітур*** *(так-так – было тут штосьці ад пінгвіна).*

*Хутка будзем піць гарбату з* ***цытрынай*** *і закусваць булачкамі з макам.*

На аснове запазычанняў *цытрына, гарнітур* пісьменнік утварае прыметнікі, якія выступаюць у пераносным значэнні і выконваюць функцыю эпітэтаў:

*У карлікаў жоўтыя* ***цытрынавыя*** *пысы, вочы нібы гнілыя аранжыкі і вусны нагадваюць леташнія мухаморы.*

*Я глядзеў на Пётру – на ягоную* ***гарнітурную*** *фігуру, на пустазельнае поле твару, на срэбны пярсцёнак на ўказальным пальцы правай рукі – і думаў пра змову.*

Франц Сіўко – аўтар кніг прозы *З чым прыйдзеш* (1991), *Апошняе падарожжа ў краіну ліваў* (1997), *Удог* (2001), *Ягня ахвярнае* (2003), *Асіметрыя* (2005), *Дзень Бубна* (2008), *Выспы* (2011). Аддае перавагу жанрам прыпавесці і кароткіх запісаў-эсэ. Лаўрэат рэгіянальнай літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча. Перакладаўся на рускую, асецінскую, балгарскую мовы.

У зборніку Ф. Сіўко *Выспы* даволі частотнымі з'яўляюцца такія лексемы польскага паходжання, як *пастарунак* (posterunek – участак (паліцэйскі), аддзяленне (міліцыі)), *страйкавы* (strajkowy – забастовачны), *каляжанка* (koleżanka – сяброўка), *імпрэза* (impreza – мерапрыемства), *пігулка, візітоўка*:

*Значыць, штосьці такое ёсць: хто б гэтак доўга трымаў у* ***пастарунку*** *невінаватага, тым больш старога ды ў дадатак не надта здаровага чалавека?*

*Апроч непярэлівак са* ***страйкавым*** *камітэтам у Кірыкаў яшчэ, аказваецца, непрыемнасці, звязаныя са здачай у арэнду памяшкання нейкай апазіцыйнай грамадскай структуры.*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



*Яна папрацавала на два ўчасткі два тыдні і ўжо амаль дачакалася вяртання* ***каляжанкі****, як здарылася нечаканае.*

*Але яму, вопытнаму наведніку* ***імпрэзаў*** *падобнага кшталту, і гэтага караценькага мігу, как ацаніць унутраны стан жанчыны, было дастаткова.*

*Люся сядзіць у здранцвенні пры вакне, лічыць* ***пігулкі*** *сахарыны.*

*І па сёння* ***візітоўка*** *Міжрэчча – срэбналістыя надвісленскія таполі.*

Алена Брава публікавалася ва ўсіх вядучых літаратурных часопісах Беларусі, калектыўных зборніках *Апавяданне – 2005*, *І зоркі над Бярэзінай-ракой*. Лаўрэат літаратурнай прэміі „Гліняны Вялес" за кнігу *Камендацкі час для ластавак*. У 2012 годзе выйшаў раман *Рай даўно перанаселены*, у якім А. Брава выкарыстоўвае такія паланізмы, як *лазенка* (łazienka – купальня, купальны пакой, ванная), *пекны* (piękny – прыгожы), *валіза* (walizka – чамадан), *кіроўца* (kierowca – вадзіцель, шафёр; кіроўца) напрыклад:

*Мы з сястрой хаваемся ад яе* [*маці*] *ў* ***лазенцы****.*

*Менавіта сваю жаноцкасць* ***пекныя*** *паненкі з плакатаў здолелі ператварыць у штучны тавар, за які гатова была плаціць уся краіна, выстойваючы чэргі да кас кінатэатраў.*

*Ён пакуе* ***валізку*** *і перабіраецца ў лабараторыю НДІ суседняга горада, дзе працуе. Каб трохі супакоіцца, яна вырашае разабраць* ***валізку*** *з адзеннем.*

*У вялізным, наскрозь прадзьмутым гаражы аўтобуснага парка, дзе ўсе* ***кіроўцы*** *ведалі мяне па імені і віталі як прынцэсу крыві, я прыціскалася шчакой да сумных конскіх мордаў маіх ЛАЗаў, гладзіла іх пыльныя бакі* […]

У першай кнізе маладой пісьменніцы Наталкі Харытанюк *Трынаццаць гісторый пра мёртвага ката* сустракаюцца такія паланізмы, як *фатэль* (fotel – фатэль; мяккае крэсла), *улётка* (ulotka – лістоўка; улётка; пракламацыя), *гэст* (gest – жэст):

*Маёр задаволена адкінуўся на спінку* ***фатэля****, упэўнены, што ўжо тут – сам-насам са сваімі ценямі – ён у поўнай бяспецы, і заснуў.*

*Ззаду засталіся: тры* ***ўлёткі****, незаўважна кінутыя на скураныя сядзенні, налепка на дзвярах і першы жоўты ліст на падлозе, які яна прынесла з сабой на кончыку парасона.*

*І раптам гэты іх* ***гэст*** *– яны не абняліся, а злёгку штурханулі адзін аднаго ў плячо.*

Вельмі папулярныя ў многіх сучасных аўтараў такія лексемы, як *таксоўка* (taksówka – таксі), *тло* (tło – фон), *файна* (fajnie – файна, класна, цудоўна), *тэчка* (teczka – партфель, папка):

*Я рухаўся на* ***таксоўцы*** *ўздоўж заліва пад акампанемент плявузгання кіроўцы, які ўсё здзіўляўся, навошта мне спатрэбілася на Гюстэпа* (В. Марціновіч). *Хісткай хеўрай ловяць замест* ***таксоўкі*** *аўтобус* (П. Касцюкевіч). *У цябе тады яшчэ неяк грошы выцягнулі* […] *І з сабой на гарэлку з сокам, не кажучы пра* ***таксоўку****, не было* […] (З. Вішнёў).

*Карэнныя мінчукі* […] *стурбавана сочаць, каб на* ***тле*** *адвячоркавага неба чорныя гмахі птушак не пачалі перарабляць на свой лад столькі гадоў рупліва ма-*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



*ляваны гарадскі рысагляд* (П. Касцюкевіч). *Галоўным чынам гэта выявы дзявочых твараў і экзатычных кветак на* ***тле*** *бляклых пасаў дажджу* […] (Ф. Сіўко).

*У нас усё* ***файна****, бо ў нас няма вайны!* (В. Марціновіч). *Напрыканцы кастрычніка* ***файна*** *стаяць у Берлінскім парку і піць каву* […] (З. Вішнёў). *І я падумаў, што такой* ***файнай*** *гісторыі не варта прападаць, і сёння вырашыў пацешыць ёй таксама іншых Юляў* (П. Касцюкевіч). […] ***Файнае*** *азначэнне, калі не браць да ўвагі, што менавіта так, „Глыбы і слаі", называўся нарыс беларускай літаратуры, што зрабіў Багдановіч у 1911 годзе* (В. Марціновіч).

*Наста расшпіліла заплечнік, дастала адтуль* ***тэчку****, расчыніла яе, вываліла змесціва на стол. У* ***тэчцы*** *было* […] *Як бы гэта апісаць* […] (В. Марціновіч). *Ад нечаканасці яна сумелася, тонкая кніжка ў мяккай вокладцы выслізнула ў яе з* ***тэчкі****, паляцела тарчма на дол* (Ф. Сіўко).

*– Што вы бачыце на гэтым фотаздымку? – запытала Алена, выцягнуўшы каляровы здымак са сваёй срэбнай* ***тэчкі*** (Н. Харытанюк). *На стале ляжала справаздача за некалькі дзясяткаў гадоў* […] *дакладней, увесь стол быў завалены* ***тэчкамі*** […] (З. Вішнёў).

Надзвычай частотнымі з'яўляюцца ў сучаснай беларускай прозе лексемы *амбасада* (ambasada – пасольства), *амбасадар* (ambasador – пасол), *палягаць* (polegać – спадзявацца; разлічваць; заключацца *ў чым*, зводзіцца *да чаго*), *выкшталцоны*, *кіроўца*:

*Тыя, хто працуе за грошы, жывуць вельмі сціпла, бо пражыць на тыя 100 баксаў,* […] *(гэта ў лепшым выпадку, калі кніжачку фінансуе нейкі фонд ці* ***амбасада!****) – немагчыма* (В. Марціновіч). *Прыгоды распачаліся з* ***амбасадаў*** (З. Вішнёў); *Вольга Андрэеўна ўжо адвяла пагляд, штосьці ціха тлумачыла суседу, мужчыну ў шэрым касцюме-тройцы – здаецца, сакратару нямецкай* ***амбасады*** (Ф. Сіўко). *І потым, ведаеце, не толькі ж чужаземным* ***амбасадарам*** *ды святарам гаманіць па-нашаму..* (Ф. Сіўко).

*Самая простая будыйская медытацыя* ***палягае*** *не ў адчыненні нейкіх кропак, выхадзе ў астрал, уяўленні сябе плямай святла ў цемры няіснага* (В. Марціновіч). *І ў чым жа яны, тыя ўзоры, на ваш погляд,* ***палягаюць?*** (Ф. Сіўко). *Галоўнае ж* ***палягае*** *ў тым, што Юля сачыняла сваё жыццё, як раман* […] (А. Брава). *Магічнасць* ***палягае*** *ў тым, што гэта не можа быць паслядоўным шэрагам вобразаў* (Н. Харытанюк).

*Спачатку настаўніца, прыгаломшаная* ***выкшталцоным*** *узорам цытат, аб'яўляе яе сачыненні лепшымі ў класе* (А. Брава). *Яна глядзіць, як знешне сімпатычны чалавек з* ***выкшталцонымі*** *манерамі дэманструе з экрана без аніякіх пакутаў сумлення галаву забітай хвіліну таму прыгажуні антылопы або аленя* […] (Ф. Сіўко). *Так атрымалася, што ў паваенных фільмах пра вайну, пакуль савецкая і амерыканская форма часоў другой сусветнай заставалася такой, як была раней, фашыстоўская з фільма ў фільм рабілася больш моднай ды* ***выкшталцонай*** (П. Касцюкевіч).

*– Памагчы з рэчамі, тата, ці без мяне дасцё рады? – пытаецца* ***кіроўца*** (Ф. Сіўко). *Калі пад'язджалі да могільнікавай брамы,* ***кіроўцы*** *адначасова далі сі-*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



*гнал* (А. Брава). ***Кіроўца*** *выцягнуў цыгарэту і запаліў. Клубы дыму акуталі нас туманам* (З. Вішнёў).

З прыведзеных прыкладаў толькі слова *візітоўка* можна аднесці да непасрэдных польскіх запазычанняў апошняга часу. Ужыванне ж лексем *імпрэза* (замест *мерапрыемства*), *выступ* (замест *выступленне*), *валізка* (замест *чамадан*), *кіроўца* (замест *вадзіцель*), *амбасада* (замест *пасольства*), *страйкавы* (замест *забастовачны*) не звязана з непасрэдным польскамоўным уплывам, а „абумоўлена так званай зменай моўных арыенціраў”[5], у выніку якой адштурхоўванне ад рускай мовы вядзе да збліжэння з польскай мовай.

Вялікая колькасць актуалізаваных у сучасным маўленні паланізмаў звязана з вяртаннем у актыўны ўжытак слоў абмежаванага выкарыстання, такіх як *мапа, пекны, слынны, выступ, філіжанка, імбрык,* пашыраных ва ўжыванні ў 20-я гады XX ст. Так, у *Беларуска-расійскім слоўніку* М. Байкова, С. Некрашэвіча (Менск 1926) зафіксаваны лексемы: *мапа* – з адпаведнікам *карта (географическая); філіжанка – чайная чашечка; імбрычак – чайник; пекны – красивый, изящный; слынны – известный; гарнітур – мужской костюм.* Некаторыя словы фіксуюцца з семантыкай, адрознай ад польскай: *тло – тлен, прах*; *выступ – выступ (выступы сонцавыя).* У польскай мове: *występ* – выступ, выступленне; *tło* – фон.

*Адсутнасць шыльдаў на ангельскай ці рускай мовах бянтэжыла, казытала нервы, аднак на каленях ляжала разгорнутая* ***мапа*** (В. Марціновіч). *Мой найлепшы сябра скраў стратэгічную* ***мапу*** *Гомельскай вобласці і цяпер мерыўся перапраможна адымчаць яе ў Нью-Ёрк* (П. Касцюкевіч); *Ён яшчэ выцягнуў сюды – па гэты бок* ***мапы*** *– некалькі дарагіх для Гары людзей* (Н. Харытанюк). *Мастак і літаратар ляжаў свежаваранай сардэлькай і ў роспачы круціў у руках кітайскі пэндзаль, думаючы пра тое, што на* ***мапе*** *Беларусь выглядае дробнай у параўнанні з Кітаем* (З. Вішнёў).

*Насамрэч, паверце чалавеку, у жыцці якога было шмат дзяўчын, прычым большасць з іх я спакусіў менавіта маімі літаратурнымі талентамі: друкаваў у „Ахрэме” апавяданне пра каханне, атрымоўваў стос лістоў ад прыхільніц, абіраў найбольш* ***пекных****, спакушаў дасціпнасцю ў „скайпе”, сустракаўся, ну і далей тарам-парам* (В. Марціновіч).

*Прынамсі, яе* ***слынная*** *мара збылася. Яна можа лічыць сябе пераможцай* […] (А. Брава).

*Усё было добра, сумневу быць не магло:* ***выступ*** *удаўся* […] *Прапаную прыступіць да абмеркавання* ***выступу*** (Ф. Сіўко).

*Мужчына ў белым халаце з прабіркай у руцэ на* ***тле*** *хімічнай лабараторыі: Мы правялі сацыялагічнае апытанне пяці тысячаў чалавек* […] (П. Касцюкевіч). *Галоўным чынам гэта выявы дзявочых твараў і экзатычных кветак на* ***тле*** *бляклых пасаў дажджу ці, наадварот, да рэзі ўваччу яркіх сонечных прамянёў* (Ф. Сіўко).

[5] А. А. Лукашанец, *op. cit.*, с. 36.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



*Збягаю ад паляўнічага ў кудравым* ***гарнітуры****, у якога ў галаве адно порах і дровы* (З. Вішнёў).

*Адзін У., як сапраўдны перформер, выцягвае плоскую* ***філіжанку*** *каньяку і прапаноўвае выпіць* (З. Вішнёў). У пададзеным кантэксце лексема *філіжанка* ўжыта ў значэнні ‘пляшка’.

*Праціснуўшыся праз свідравіну калідора, мы апынуліся ў падсобным памяшканні, дзе ўжо рыпеў* ***імбрык*** *ды стаялі кубачкі – нібы запрашэннем для вывучэння тэмы „My kitchen” на якой-небудзь складанай мове* […] (В. Марціновіч). *А побач белы* ***электраімбрык*** *гудзе і булачкі толькі выпечаныя попелам упрыгожваюцца* (З. Вішнёў).

Трэба заўважыць, што слова *imbryk* у польскай мове абазначае заварнік. У паданых прыкладах гаворка ідзе пра чайнік для кіпеню (то бок на беларускай глебе гэты назоўнік пашырыў семантычны аб’ём).

Такія лексемы, як *файны, пекны, тэчка, валізка, пігулка* выкарыстоўваюцца ў памежных гаворках (многія маюць больш шырокую, чым у польскай мове, семантыку, некаторыя адрозніваюцца гукавым афармленнем). Так, у *Слоўніку беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча* ў 5 тт. (1979–1986) прыметнік *файны* (*хвайны*) фіксуецца ў значэннях: 1. Які мае дадатныя рысы характару; 2. Прыгожы; 3. Добрага заводу, з добрымі якасцямі; 4. Смачны; 5. Добрага гатунку; 6. Ураджайны; 7. Урадлівы; 8. Ясны, цёплы (пра пагоду). Прыслоўе *файна* (*файно*) мае значэнні: 1. Добра; 2. Смачна; 3. Моцна; 4. Прыгожа; 5. Багата.

Прыметнік *пекны* зафіксаваны ў значэннях: 1. Прыгожы. 2. Добры; прыслоўе *пекна* (*пекне*) – 1. Прыгожа, добра. 2. Здатна, лоўка.

Назоўнік *тэчка* выступае ў наступных значэннях: 1. Партфель; 2. Сумка; 3. Торба. Акрамя таго, ён мае амонімы: *тэчка*$^2$ – тое, што і туркач (мядзведка) і *тэчка*$^3$ – шост.

Фіксуюцца ў названым слоўніку і лексемы *валіска* – чамадан; *пігулка, пігулачка* – таблетка; *пастарунак* – пост; *кнайпа* – шынок; *фрызер, фрызіер* – цырульнік.

Некаторыя з сучасных аўтараў выкарыстоўваюць адзінкавыя лексемы, якія адсутнічаюць у мове твораў іншых пісьменнікаў. Напрыклад, у В. Марціновіча: *Гэты тэкст цалкам з’яўляецца маёй* ***выналезкай*** *і не звязаны ні з воднай з вядомых аўтару формаў рэальнасці* (wynalazek – вынаходства).

У З. Вішнёва: *Ты сваім аповедам пра юшку натхніў мяне на рыбную* ***зупку****!* (zupa – 1. суп; 2. першая страва). *Вучыся выкройваць нармальны* ***шлафрок****!* (szlafrok – шлафрок, халат). *Ідзеш па вуліцы і разумееш, што гэта не горад* ***кнайпаў*** (knajpa – шынок, піўнушка; забягалаўка). Лексема *кнайпа* сустракаецца і ў Н. Харытанюк: *Адным з такіх падарункаў, якім я сапраўды пацешыла дзядулю, была кніга пра* ***кнайпы*** *Львова*.

Ф. Сіўко такія „непапулярныя” лексемы выкарыстоўвае ў якасці характарыстыкі мовы персанажаў: *– А я дык і не сумнявалася, што гэтак скончыцца, – кажа раздатчыца Зінаіда і падцінае танюткія, быццам усохлыя з-за недахопу плоці, што ўся пайшла на фармаванне іншых частак неабдымнага,* ***альбжымага***

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



– *Алушына слоўка – цела, вусны* [аўтар падае спасылку: *велізарнага, агромністага (ад польскага olbrzymi)].

Акрамя таго, пэўныя намінацыі польскага паходжання ўжываюцца для прыдання тэксту каларыту, напрыклад, *пянёндзы* (pieniądze – грошы), *крэсавы* (kresowy – ускраінны; памежны):

*…Я з аўтамата дзынькнула Вальдэмару, але ж ён сказаў, цяпер на Шоду кліентаў няма, а тыя што былі – усіх пабралі, лёгкіх* ***пянёндзаў*** *з каталікоў не навышмандоўваеш, дык выправіліся ў сквот, там былі студэнты з нейкага беларускага універу* (В. Марціновіч). *Нашы выхаваныя ў* ***крэсавых*** *школах дзяды-прадзеды занадта добра ведалі сваё месца, каб замахвацца на большае, чым дазваляла ім іх паходжанне* (Ф. Сіўко).

Залішняе ж паглыбленне ў стыхію польскамоўнага ўплыву можа прывесці да моўных памылак, у прыватнасці да таўталогіі. Напрыклад: *Вось апошняе, што звязвала яго з Настай,* ***пекнай прыгажуняй*** *са станам далікатным, нібы вітая калона часоў барока, лялька, лялька з адарванай нагой* […] (В. Марціновіч).

Выбар той ці іншай лексемы залежыць і ад прыхільнасцей аўтара. Так, П. Касцюкевіч, Ф. Сіўко лексему *капэрта* не выкарыстоўваюць, аддаючы перавагу беларускай *канверт: Яна паварочваецца тварам да Дарашэнкі, слізгае вачыма па* ***канверце*** […] (Ф. Сіўко). […] *Мы будзем атрымліваць адно* ***канверты*** *і радасці скупыя тэлеграмы* (П. Касцюкевіч).

А. Брава не мае схільнасці да паланізмаў *таксоўка, чыннік, пігулка,* ужываючы лексемы *таксі, фактар, таблетка*:

*Калі мы ехалі на могілкі на старэнькім, вылучаным аўтапаркам ЛіАЗе, следам урачыста плылі* ***таксі****…*

*Я не філосаф, я клініцыст. І мой досвед пераконвае ў тым, што ўсё залежыць ад двух* ***фактараў****: спадчыннасці ды ўмоў выхавання, ад генатыпу і фенатыпу.*

*Дзед паміраць баяўся. Ён глытаў мноства* ***таблетак****, запарваў нейкія карэнні ды часта перабіраў невялічкія, не большыя за скрыначку ад запалак, чорна-белыя фотаздымкі.*

Увогуле, такія словы, як *тло, тэчка, капэрта, таксоўка, гэст* з пункту гледжання намінатыўнай запатрабаванасці з’яўляюцца збыткоўнымі, аднак выступаюць своеасаблівымі *маркерамі* маўлення таго кола насельніцтва, што карыстаецца беларускай мовай штодня. Па меркаванні Г. Арцямёнка, „прычыны своеасаблівага *рэнесансу* польскамоўнага ўплыву звязаны, відавочна, з пошукамі рацыянальных шляхоў развіцця слоўнікавага саставу беларускай мовы. […] Прадстаўнікі беларускай творчай інтэлігенцыі звяртаюцца да здабыткаў польскай мовы, магчыма, падсвядома ўспрымаючы яе як своеасаблівы *мост* у свет заходняй, еўрапейскай цывілізацыі”.[6]

6 Г. Арцямёнак, *Беларуска-польскае лексічнае ўзаемадзеянне на сучасным этапе,* [у:] *Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый”*, Мінск 2001, с. 147.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 23/11/2024 07:52:46



Усе названыя запазычанні з польскай мовы абслугоўваюць штодзённую, побытавую сферу жыцця. Лексічны склад справавой ці навуковай сферы паланізмамі практычна не папаўняецца. Выключэннем з'яўляецца лексема *кіроўца*, якая знайшла пашырэнне ў тэрміналогіі і была выкарыстана ў *Правілах дарожнага руху* (2012), перакладзенага Таварыствам беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Напрыклад: *Кіроўца – фізічная асоба, якая кіруе транспартным сродкам, за выключэннем асобы, якая навучаецца кіраванню механічным транспартным сродкам. Да кіроўцы прыраўноўваюцца асоба, якая навучае кіраванню механічным транспартным сродкам і пры гэтым знаходзіцца ў ім, а таксама коннік, паганяты жывёлы.*

Шмат якія з прыведзеных лексем увайшлі ў актыўны ўжытак, пра што сведчыць іх фіксацыя ў *Слоўніку новых слоў* В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч (2009). Гэта такія словы, як *амбасада, імпрэза, выступ, кіроўца, выбітны, файны, філіжанка, мапа, выкшталцоны, страйкавы, улётка, унёсак, пастарунак, каляжанка, візітоўка*. Не знайшлі адлюстравання ў *Слоўніку* паланізмы *імбрык, валіза, слынны, тло, фатэль, палягаць, пекны, тэчка, капэрта, таксоўка, лазенка, пігулка, атракцыя, агенцыя*. Некаторыя з іх выкарыстоўваюцца асобнымі аўтарамі і не маюць шырокага распаўсюджвання сярод носьбітаў беларускай мовы (*атракцыя, агенцыя, капэрта, лазенка, пігулка, тэчка*). Разам з тым, такія лексемы, як *палягаць, валіза, фатэль, імбрык, тло, слынны, пекны* знаходзяць усё большае распаўсюджванне і маюць тэндэнцыю да сталага замацавання ў сучаснай беларускай мове.

**Summary**

The article is devoted to the problem of updating of borrowings from the Polish language in the modern Belarusian language which is caused by purifying the tendency towards nationalization. The examples of Polonisms in artistic prose by current Belarusian writers are provided in the article. It is concluded that lexemes of the Polish origin are becoming more common and tend to be permanently fixed in the modern Belarusian language.